Матуйза Д.Ю., магістрант
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Сцепанцоў А.І.,
кандыдат культуралогіі, дацэнт

# МУЗЫКА ТРАДЫЦЫЙНАГА ГРАМАДСТВА ЯК КУЛЬТУРНЫ ТЭКСТ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Музыка, асабліва традыцыйная, з’яўляецца невычэрпнай крыніцай інфармацыі аб грамадстве, якое яе нарадзіла, і можа разглядацца як культурны тэкст. Аднак, зараз мы не заўсёды задумваемся над паходжаннем пэўных музычных феноменаў, што прыводзіць да скажэння музычных з’яваў. Асабліва гэта датычыцца традыцыйнай музыкі чужых для нас культур.

У якасці *аб’екта даследвання* выступае феномен культуры традыцыйнага грамадства, а *прадметам* з’яўляецца музыка. Трэба ўдакладніць, што, калі мы разглядаем феномен музыкі ў дачыненні да традыцыйных грамадстваў, асабліва тых, што яшчэ не дасягнулі этапу цывілізацыі (гэта значыць, прынамсі, не маюць развітай пісьменнасці), то патрабуецца ўдакладненне гэтага паняцця. Неправамерна выкарыстоўваць у дадзеным выпадку дыфініцыю музыкі ў якасці формы мастацтва, паколькі цяжка выдзеліць у разглядаемых намі грамадствах мастацтва ў прынцыпе. Галоўнай асаблівасцю культуры дадзеных супольнасцяў з’яўляецца, як ўсім вядома, сінкрэтызм: музыка яшчэ не з’яўляецца ўласна мастацтвам, а калі і так, то не заўсёды існуе падзел на вакальную музыку, інструментальную і танец. Таму прапануем тут у якасці паняцця *“музыка” разглядаць працэс і вынік працы з гукавым матэрыялам, які ўспрымаецца прадстаўнікамі пэўнага грамадства як крыніца інфармацыі, выклікае ў іх пэўныя эмоцыі і пабуджае да адпаведных дзеянняў.*

Асноўнай *мэтай* дадзенай работы з’яўляецца характарыстыка музыкі як культурнага тэкста. Асноўныя *задачы*: 1) апісаць музыку традыцыйных грамадстваў як семіятычную сістэму; 2) вызначыць ролю, якую адыгрывае музыка ў традыцыйным грамадстве; 3) паказаць магчымасці практычнага

выкарыстання дадзенага матэрыялу для даследвання культуры традыцыйных грамадстваў. Дзеля вырашэння пастаўленых задач падаецца мэтазгодным пералічыць пытанні, адказы на якія можна атрымаць дзякуючы даследванню традыцыйнай музыкі.

**1) Узровень развіцця грамадства.**

Аналіз музычнай культуры паказвае ўзровень развіцця тэхналогій пэўнага грамадства: колькасць і разнастайнасць інструментаў; матэрыялы, з якіх яны выраблююцца, складанасць канструкцыі. Таксама ярка прасочваецца варыятыўнасць сацыяльных сувязяў і складанасць сацыяльнай структуры. Чым больш развітае грамадства, тым больш складаная і разнастайная музычная традыцыя: падзел грамадства на групы, у тым ліку няроўныя па сацыяльнаму статусу, прыводзіць да з’яўлення розных музычных традыцый ў межах агульнай; ускладняюцца музычныя формы, з’яўляюцца аркестры, у складзе якіх разнастайныя інструменты, хоры. Нават у прымітыўных грамадствах можна ўбачыць розніцу ў статусах мужчыны і жанчыны, падлеткаў і дарослых, правадыроў і простых супляменнікаў.

**2) Тыповы нацыянальны і этнічны характар, псіхалагічны партрэт асобы.**

Менавіта музыка з усей легкасцю адлюстроўвае ўсю разнастайнасць характараў і тэмпераментаў прадстаўнікоў розных этнічных супольнасцяў. Напрыклад, супольнасці, схільныя да сузіральнасці, музіцыруюць, хутчэй, дзеля ўласнага задавальнення; больш экспансіўныя аддаюць перавагу музыцы гучнай і насычанай. Напрыклад, пераважная большасць музыкі афрыканцаў адрозніваецца разнастайным рытмам, даволі хуткім тэмпам, але простай танальнай структурай, яркай эмацыйнасцю, ствараецца, часцей за ўсё, падчас калектыўнага музіцыравання. Наадварот, музыка жыхароў Паўднёва-Усходняй і Усходняй Азіі больш павольная, звычайна простыя рытмы, але разнастайная танальная структура, кожнаму асобнаму гуку надаецца вялікае значэнне. Згаданыя тэндэнцыі праяўляюцца і ў танцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Няцяжка звязаць усе гэтыя асаблівасці музыкі з пэўнымі рысамі тыповага прадстаўніка этнічнай групы.

**3) Прыроднае асяроддзе.**

Гукавая хваля паводзіць сябе па-рознаму ў розных экалагічных асяроддзях. Гэтыя экаасяроддзі валодаюць спецыфічным характарам і інтэнсіўнасцю так званай "гукавой зашумленасці", спецыфікай гукавога фону які нараджаецца дадзенай экасферай, тыпам гукавога ўспрымання людзей, якія там жывуць, характарам разумення як акаляючага свету, так і сябе, свайго голасу ў ім. Розныя ландшафтныя зоны Зямлі нараджаюць спецыфічныя тыпы гукамузычнай экспрэсіі. Напрыклад, экспрэсія чалавека, які жыве ў акаленні лесу з яго няспынным прыродным фонам, будзе мець агромністы спектр для гукавога падражання; адначасова, гэта запатрабуе асобых хітрыкаў у вынаходніцтве гукавых тэмбраў, якія перакрывалі б усю гэтую шумлівую прастору, альбо б выдзяляліся з яе. А вось ва умовах пустыні, якая валодае амаль абсалютнай цішынею, гукавое выказванне можа ажыццяўляцца на ўзроўні "тонкіх" планаў, з абыгрываннем абертонікі, з прыхільнасцю да ціхага, празрыстага гучання, з падкрэсленым слуханнем пауз, калі "цішыня сама гучыць"; гук тут можа ствараць цікавыя мроі. Горныя мясцовасці могуць выклікаць прыхільнасць да шматгалосся, якое легка і натуральна ўзнікае ўжо нават у выніку стварэння аднаго гука, які дзясяткамі адбіткаў разлятаецца па ўсей прасторы. Ландшафт, які мае значныя водныя плошчы, стварае ўнікальную акустыку, калі ў гукавой плыні высвечваецца кожная дэталь, і гук добра чутны на вялікія адлегласці. Цывілізацыі горных мясцовасцяў таксама пішуць своеасаблівую музыку. З прычыны атмасфернага ціску на ўнутранае вуха і галасавыя звязкі іх гукі насычаныя высокімі і басовымі частотамі. Жыхары Тыбету, спадкаемцы старажытных інкаў у Андах, людзі, якія жывуць у Альпах альбо на Урале, звычайна пяюць і размаўляюць грубым голасам, поўным нізкіх таноў, якія змешваюцца з фальцэтам і іншымі высокачастотнымі гукамі, што адлюстроўвае той унікальны лад жыцця сярод гор, далінаў, які яны вядуць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, можна растлумачыць прыродную дэтэрмінаванасць музычнай культуры – чалавек стварае толькі тое, падабенства і прыклад чаго бачыць або чуе навокал. Адсюль і паліфанічны характар музыкі жыхароў лясных мясцовасцяў. Назіраць гэта ў пустынях мы не можам, бо не існуе такіх крыніц гучання, як і матэрыялу для вырабу патрэбных інструментаў.

**4) Перадача інфармацыі на гарызантальным і вертыкальным узроўнях.**

Гарызантальны ўзровень перадачы інфармацыі – у межах пакалення за кароткі прамежак часу. Гэты феномен цудоўна ілюструе інстытут “размаўляючых барабанаў” у Афрыцы. Змяненне вышыні тона барабана залежыць ад таго, па якой дзялянцы прыходзіцца ўдар, яго моцы, хуткасці рытмічнага малюнка, лінгвістычных асаблівасцяў народа. Здольнасць барабанаў “размаўляць” абумоўленая тым, што некаторыя мовы з’яўляюцца танальна-семантычнымі. Адсюль шчыльная сувязь з маўленнем і музыкай. Павышаючы ці паніжаючы гукі, выдаваемыя інструментамі, можна адрозніць нават роўныя па колькасці складаў і гукаў словы. “Моваю” барабана афрыканцы перадаюць паведамленні, навіны і г. д. Нездарма, гэтыя барабаны называюць “бездрацяным тэлеграфам”. З дапамогаю гукаў музычных інструментаў, спеваў, танцаў, людзі ілюстравалі спосабы палявання і іншых гаспадарчых заняткаў, правілы полавых і грамадскіх стасункаў і г. д. Вертыкальны ўзровень перадачы інфармацыі – ад продкаў да нашчадкаў, забяспечвае сувязь паміж пакаленнямі і ажыццяўляецца, у асноўным, праз міфы і легенды, якія часцей за ўсё суправаджаліся спевамі, інструментальным суправаджэннем і танцамі. Асабліва важная роля дадзенаму феномену надаецца ў дапісьмовых грамадствах. Аднак, паведамленні нашчадкам перадаваліся не толькі ў славеснай форме: згаданыя вышэй прыёмы ілюстрацыі маглі існаваць даволі працяглы час. З цягам часу, гэтыя спосабы перадачы інфармацыі страчваюць сваю асноўную інфармацыйную функцыю і ператвараюцца ў элементы музычнага тэксту або танца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**5) Гісторыя грамадства і ўзаемапранікненне культур.**

Гэтае пытанне шчыльна звязанае з папярэднімі, у першую чаргу, з перадачай інфармацыі на вертыкальным узроўні, і можа з'яўляцца фіналам комплекснага даследвання. Нейкія вывады аб гісторыі развіцця грамадстваў мы можам зрабіць выкарыстоўваючы апісаныя вышэй падыходы і абапіраючыся на аналіз зменаў у музычнай традыцыі на працягу пэўнага перыяда.

Музыка дае нам яскравыя сведчанні ўзаемадзеяння розных культур, калі музычныя традыцыі аднаго грамадства аказваюць уплыў на традыцыі іншага. Такім чынам, выяўляючы нехарактэрныя для дадзенай супольнасці музычныя з'явы, мы можам меркаваць аб часе і характары кантактаў з іншымі культурамі.

Музыка з'яўляецца вельмі важным культурным тэкстам, які нельга абмінуць пры вывучэнні культуры грамадства, асабліва традыцыйнага. На нашу думку, пры больш дэталёвай распрацоўцы, дадзены матэрыял можа стаць асновай праграмы даследвання музычных традыцый розных супольнасцяў.

Спіс выкарыстаных крыніц:


1. Васильченко Е. В. Вертикальная структура музыкального текста: несколько сравнений на цивилизационном уровне.// Европейский семинар этномузыкологов., 1990
2. Васильченко Е. В. Музыкальные культуры мира. - М., 2001
3. Готединер А. Л. Музыкальная психология. - М., 1993
4. Михайлов Дж. К. К проблеме теории музыкально-культурных традиций./ Музыкальные традиции стран Азии и Африки. - М., 1986


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ